3. Прямой обязанностью крестных родителей становилось обязательное присутствие их в храме во время венчания тех, кого они когда-то окрестили.

Еще раз отметим, что вся эта полифония ценностного мира традиционной культуры постепенно разрушается под воздействием современных культурных процессов. Некогда этноопределяющая духовная доминанта сегодня становится всего-навсего одной из субкультур национальной культуры.

В заключение хочу сказать, что в многочисленных научных, и особенно политологических, пассажах констатируется аксиома приоритета социального уважения к духовному наследию предков, набирает обороты общественная инициатива создания Национального реестра элементов нематериального культурного наследия под эгидой ЮНЕСКО, однако все это инициативы не прямых носителей культурных ценностей. А посему хотелось бы надеяться на то, что духовно-образовательно пространство Белорусского государственного университета культуры и искусств будет постоянно стимулировать интерес молодого поколения к этническому наследию наших предков и способствовать тенденции более выразительного и продуманного процесса национально-культурной самоидентификации.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***У. Ф. Красюк,***
*кандыдат філасофскіх навук,*
*дацэнт, дацэнт кафедры філасофіі*

# КУЛЬТУРА І КУЛЬТУРНАСЦЬ: ТРАДЫЦЫІ І НАВАЦЫІ

Планетарны характар глабалізацыі ставіць перад народамі шэраг праблем, ад вырашэння якіх залежыць іх выжыванне. Усё большую значнасць набываюць магчымасці развіцця культуры, бо ў варунках крызісаў яна найбольш заўсёды цярпела, і сёння яе каштоўнасці ў асаблівай небяспецы: матэрыяльныя знішчаюцца (Пальміра, скальныя выявы Будды, спадчына шумераў у музеях Ірака), духоўныя скажаюцца. Шматвекавы вопыт нацыянальных культур становіцца незапатрабаваным. XXI ст. характарызуецца дыфузнымі працэсамі, маргіналіза-

цыяй сацыяльных супольнасцей, фікцыяй «вялікага перасялення народаў». Пашыраецца сфера мультыкультуралізму, перспектывы якога неадназначныя.

Этнас як сістэма, што самарэгулюецца, імкнецца да самарэалізацыі, галоўным чынам на аснове аптымальнага функцыянавання гістарычна абумоўленай культуры. XXI ст. доўжыць лінію папярэдняга веку на ўзаемадзеянне культур. Стварэнне сусветнай інфармацыйнай прасторы актывізуе працэсы абсорбцыі, адноснага засваення асобнымі нацыянальнымі культурамі каштоўнасцей другіх. Пры гэтым мае месца супярэчлівае пранікненне культурных пластоў не толькі блізкіх па гістарычных лёсах, але і тых, якія ў цывілізацыйным аспекце з'яўляюцца «нясвойскімі», незразумелымі, а то і чужымі. Скажам, сучасным немцам здаюцца непрымальнымі сацыяльныя, культурна-рэлігійныя, светапоглядныя каштоўнасці рэпатрыянтаў з Бліжняга Усходу, Афрыкі, іншых рэгіёнаў, і наадварот.

Вектар развіцця інфармацыйнага грамадства скіраваны ў будучыню. Менавіта ў ёй вырашыцца пытанне аб выжыванні культур розных этнасаў, іх самабытнасці. Ужо сёння выклікае трывогу здольнасць беларусаў захаваць сваю ідэнтычнасць у крос-культурнай прасторы. Футуралагічны кантэкст пытання неабходна пераводзіць у прагматычнае рэчышча, а менавіта – як спалучыць векавыя сэнсавызначальныя традыцыі, побытавыя практыкі, працоўную мараль, народна-песенную творчасць, усю сукупнасць духоўнай ментальнасці з фарматам кіберпрасторы, засіллем псіхалогіі інструментальнага спажывання? Інтэрнацыяналізацыя сеткавага свету розных этнасаў змяшчае рызыку быць грамадствам «турбулентнай эвалюцыі» без прадказальных наступстваў. Перад нашай рэспублікай стаяць задачы інавацыйнага развіцця, што немінуча выкліча пашырэнне сферы новых тэхналогій, станаўленне электроннай культуры. Гэта будзе змяняць характэрныя для беларусаў вытворчыя характарыстыкі, сістэму міжасобасных зносін, звыклыя абрадавыя формы баўлення часу і, зразумела, запатрабуе іншых адносін да матэрыяльнага прадукту.

Побач з пазітыўнымі навацыямі патэнцыяльна праявяцца і негатыўныя. Што можна ім супрацьпаставіць? Адказ дае рэальнае жыццё – устойлівасць у зберажэнні сваёй ідэнтычнасці, этнасацыяльна-духоўнай цэласнасці ва ўмовах уздзеяння і прыняцця новых тэндэнцый быцця, уменне карыстацца сваёй

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культурнай спадчынай, культурнасць у стаўленні да сваіх і чужых звычаяў. Перш за ўсё патрэбна зберагчы ад размывання свой нацыянальны характар, які дапамагаў народу выстаяць на цярністым гістарычным шляху. Сукупнасць духоўных пазіцый і сацыяльных паводзін дазволіць крытычна асэнсаваць і засвоіць новыя стандарты, у чымсьці змяніць свае неадпавядаючыя часу стэрэатыпы. Адсутнасць моцнай нацыянальнай ідэі негатыўна адбіваецца на зацвярджэнні ў новых умовах каштоўнасцей нацыянальнай культуры. У культуры беларусаў духоўная сінергія выяўляецца ў спалучэнні заходняга рацыяналізму з усходняй пачуццёвасцю. Уваходжанне ў інфармацыйную цывілізацыю актывізуе здольнасць працаваць з разнастайнымі ведамі, мысліць тэхналагічна. У такіх умовах важна не страціць душэўнасці, талерантнасці, уласцівых нашаму народу, якія могуць ісці поруч з сучаснымі патрабаваннямі «зразумець іншага». Сінергічны механізм самаарганізацыі арганічна здолее спалучыць народную мудрасць з аксіялагічнымі кампанентамі постіндустрыяльнага грамадства. Некрытычнае засваенне сусветнага вопыту без уліку спецыфікі асобаснага сацыякультурнага ўтварэння можа прывесці да непрадказальных вынікаў. Калі да гэтага дадаць нігілістычнае стаўленне да сваіх культурных каштоўнасцей і традыцый, то будучыня можа бачыцца змрочнай. Гісторыя ведае шмат прыкладаў знікнення народаў з прычыны размывання іх этнакультурнай цэласнасці. Таму перад насельніцтвам нашай рэспублікі паўстае патрэба больш прыхільна ставіцца да ўжывання на практыцы штодзённага жыцця таго багацця культуры, якае прадстаўлена ў прадуктах матэрыяльнай і духоўнай вытворчасці. Неабходна павышаць узровень культурнасці як умення карыстацца культурнымі каштоўнасцямі. Гэта можна разглядаць у якасці экзістэнцыяльнай праблемы. Плаванне ў інфармацыйным моры яшчэ не азначае рэальнага авалодання неабходнымі для прадуктыўнай жыццядзейнасці кампанентамі культуры.

Гістарычна культурнасць як форма сацыялізацыі прарастае ў лоне народнай культуры, а са з'яўленнем элітарнай культуры яна набывае асобы змест. Больш складаным з’яўляецца пытанне аб культурнасці адносна яе месца ў масавай культуры. Культурнасць – гэта ўменне шанаваць сваё этнічнае, духоўнае і матэрыяльнае, багацце, а праз яго – і агульначалавечае. «Хто не дбае свайго, той не цэніць чужога» – гэтая народная муд-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

расць вельмі актуальная ў дачыненні да свайго, беларускага, з аднаго боку, і «чужога», іншаэтнічнага, з другога [1; 6]. Культурнасць – гэта ўменне свядома карыстацца культурнымі багаццямі, гэта пазіцыя чалавека ў стаўленні да сапраўдных каштоўнасцей культуры. Нават далёкая ад прафесійнай культуратворчасці асоба не можа пазітыўна спажываць культурны прадукт, не ўкладваючы суб'ектыўна ў яго сваё разуменне, упэўненасць у яго мэтазгоднасці і прызначэнні. Культурнасць ёсць асобасны ўклад у «жыццё» выяў культуры. Да таго ж гэта ёсць тварэнне культуры – у думках, паводзінах, адносінах, працы, побыце, імкненні авалодаць дасягненнямі чалавецтва і, нарэшце, у далучэнні да мастацкай творчасці. На думку пратэстанцкага філосафа Р. Гвардзіні, культура як з'ява сама па сабе не з'яўляецца надзейным парадкам жыцця – яна ёсць улада над сутнасным, над рэчамі і людзьмі, што набыла пачварныя памеры. У проціпастаўленне такому падыходу да культуры ён вынаходзіць ідэал «не-культурнай культуры» якая павінна будавацца, на яго думку, на рэлігійным падмурку і якая дазволіць чалавеку валадарыць над самім сабой і быць гаспадаром свайго лёсу. Культурнасць выступае сродкам зацвярджэння праўды, як практычны экзістэнцыяльны момант, што ставіць чалавека перад асабістым выбарам. Культурнасць – гэта і працэс засваення каштоўнасцей культуры, і рэалізацыя магчымасцей карыстацца дасягненнямі апошняй. Яна дае аснову для крытычнага стаўлення асобы да самой сябе як носьбіта культуры і суб'екта культурнага ўздзеяння. Самаідэнтыфікацыя асобы немагчымая без уяўлення сябе чальцам той ці іншай духоўнай агульнасці, што зацвярджаецца праз індывідуальныя дыспазіцыі, якія склаліся гістарычна ў межах пэўнай культуры.

Феномен культурнасці пазітыўна праяўляецца ў часы культурных разломаў, межавання сацыяльных эпох, крызісаў грамадскіх сістэм. У пунктах біфуркацыі, калі ідзе вылучэнне напрамку развіцця ў сітуацыі хаосу, няўстойлівасць падзей негатыўна адбіваецца на духоўным адчуванні грамадства. Менавіта тут ступень культурнасці грамадзян вызначае ступень сталасці духоўна-сацыяльнага патэнцыялу народа. Узнікае магчымасць зберагчы нацыянальныя традыцыі, не даць ім растварыцца ў віхуры недакладнасці падзей, спалучыцца з новымі тэндэнцыямі. Сёння, калі рэаліі глабалізацыі свету складаюць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пагрозу існаванню нацыянальных культур, відавочна праяўляецца здольнасць апошніх арганічна ўспрымаць, апрацоўваць, крытычна асэнсоўваць навацыі і даваць эфектыўны адказ на выклікі часу. Такая здольнасць праяўляецца ў менавіта культурнасці. М. Мамардашвілі папярэджваў аб антрапалагічнай катастрофе, што параджаецца разбурэннем культуры, мовы, здольнасці чалавека ажыццяўляць намаганні па станаўленні сапраўднасці свядомасці. Культурнасць – гэта не толькі ўменне карыстацца культурай – яе можна бачыць у «пастаянным намаганні па выкананні поўных і цэласных актаў думкі, што ўтварае інтэлігібельную форму мыслення ў мэтах узнаўлення і зберагання яе ў культуры» [2, с. 439].

У якіх сферах сучаснага жыцця культурнасць актуальна праяўляе сябе як неад'емны складнік соцыуму? Пэўна, зараз найбольш актуальным пытаннем з'яўляецца ўменне разумна карыстацца Інтэрнетам. Як глабальная камп'ютарная сетка ён дае шэраг бліскучых магчымасцей для сваіх карыстальнікаў. У той жа час праца ў новай – віртуальнай – рэальнасці мае спецыфічныя формы актыўнасці і паводзін асобы. Уваход у віртуальную рэальнасць аўтаматычна выклікае своеасаблівае стаўленне карыстальніка да атрымання інфармацыі, яе інтэрпрэтацыі і асэнсавання. Чалавек з навыкамі культуры працы зможа аптымальна эфектыўна ажыццяўляць камунікацыйны працэс, кантралюючы і асэнсоўваючы свае паводзіны. У гэтым праяўляецца яго культурнасць як карыстальніка, актыўнага, свядомага спажывальніка і – творцы. Недахоп, а тым больш адсутнасць культуры карыстання прыводзіць да цяжкіх наступстваў – інтэрнэтзалежнасці: механічнага, без асэнсавання, успрымання інфармацыі, маніякальнай цягі да новых уражанняў, што шкодна адбіваецца на псіхіцы і здароўі.

Новыя формы атрымання інфармацыі пры дапамозе Інтэрнета, аўдыя-, відэа-, тэле- і іншых камунікацыйных сродкаў прымушаюць па-новаму паглядзець на традыцыйныя віды культурна-мастацкага жыцця. Не будзе памылкай сказаць, што сёння культурнасць асобы як нідзе праяўляецца ў стаўленні да такой традыцыйнай сферы творчага жыцця, як тэатр. Людзі, асабліва моладзь, не ходзяць у тэатр не таму, што там дрэнныя пастаноўкі, а таму, што, як самі прызнаюцца, не разумеюць яго. Тэатр адмаўляецца як від – матрыца мастацтва; у параўнанні з іншымі відамі мастацкай прэзентацыі да яго часам

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фарміруецца негатыўнае стаўленне. У той жа час яго выпаданне з кантынуума духоўна-праксіялагічнай дзейнасці не садзейнічае генерацыі асобы сучаснага тыпу як гарманічна развітой, бо адсутнічае пачуццёва-эмацыйны складнік, што з'яўляецца адным з інтэграцыйных актывізатараў матывацыі дзейнасці.

Наогул, культурнасць сучаснага чалавека, які жыве ў тэхналагічным асяроддзі, праяўляецца ў яго стаўленні да гістарычна абумоўленых, аднак у сучасным свеце не асабліва прывабных для шырокай публікі, форм дачынення да культуры. Возьмем, да прыкладу, той жа тэатр. Сучасныя спосабы авалодання адпаведнай інфармацыяй пры дапамозе тэле-, аўдыя-, кіна-, відэатэхнікі Інтэрнета захапляюць спажыўца эфектыўнасцю трансляцыі, яркасцю падачы дзеі, дынамікай сюжэта. Тэатр жа патрабуе не пасіўнага ўспрымання, элементарнай фіксацыі ўбачанага-пачутага, а духоўнай аддачы гледача, своеасаблівага «супрацоўніцтва» з акцёрамі, і праз іх − з пастаноўшчыкамі і аўтарам, адначасова прымаючы неабходную дыстанцыю. Па словах К. Станіслаўскага, для таго, каб зразумець тварэнні генія, дабрацца да думкі аўтара, неабходна гэтыя думкі адчуць, перадумаць хаця б палавіну таго, што перадумаў аўтар. На гэта здольны толькі чалавек высокай культуры, які паважае тэатральнае мастацтва, ужо не кажучы пра опернае. На жаль, у Нацыянальным акадэмічным Вялікім тэатры оперы і балета да крыўднага мала якраз нацыянальных пастановак, затое прыемна, што такіх спектакляў стала больш у Беларускім дзяржаўным акадэмічным музычным тэатры. Такім чынам, карыстанне культурнымі каштоўнасцямі азначае для культурнага чалавека здольнасць успрыняцця не толькі сучасных папулярных форм культуратворчасці − эстрады, цырка, відэа і г. д., але і такой векавечнай творчай з'явы, як тэатр. У той жа час даволі пашырана пазіцыя значнай часткі абывацеляў: тэатр − рудымент гісторыі; яго не наведваю таму, што не разумею яго.

Культурнасць праяўляецца і ў далучэнні да такіх форм успрыняцця культуры, як наведванне музеяў, карцінных галерэй, мастацкіх выставак, творчых імпрэз, вечарын, з дапамогай якіх адбываецца культурная трансмісія.

Неабходнасць засваення культурных каштоўнасцей у тым, што асоба праз гэта зможа акрэсліць дасканаласць свайго існавання, знайсці сябе ў сучасным няўстойлівым свеце. Быццё набывае сэнс, калі напоўнена зместам, а па-за культурай яго не



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

знайсці. Існуе шмат змястоўных навуковых распрацовак адносна зацвярджэння і ўдасканалення культуратворчасці, і гэта радуе. Тым больш трэба надаваць увагу і праблеме засваення вынікаў апошняй. Італьянская прыказка гаворыць: «Не ўсе могуць жыць на галоўнай плошчы, але ўсе могуць хадзіць па ёй і грэцца на сонейку». Можна дадаць сцвярджэнне К. Маркса пра тое, што можна і не быць уласнікам культурных каштоўнасцей, але імі можна карыстацца як агульным набыткам. У гэтым і праяўляецца культурнасць.

Да слова «культурнасць» звычайна ставяцца лёгка, але жыць адпаведна яго сэнсу − вельмі складана.


1. *Цітоў, В. С.* Прадмова / В. С. Цітоў // Народная культура Беларусі. Энцыкл. давед. / пад рэд. В. С. Цітова. − Мінск : БелЭн., 2002. − 432 с. : іл.

2. *Бабайцев, А. Ю.* Мамардашвили / А. Ю. Бабайцев // Постмодернизм. Энциклопедия / сост.: А. А. Грицанов, М. А. Можейко. − Минск : Интерпрессервис, 2001. − 1040 с.



***Л. Е. Кульбицкая,***
*кандидат филологических наук, доцент,*
*доцент кафедры общенаучных дисциплин*
*Института предпринимательской*
*деятельности*
***А. Б. Кульбицкий,***
*социальный педагог студенческого городка БГУ*


## «ЧАСТНЫЙ ЧЕЛОВЕК» И. БРОДСКОГО И ГОСУДАРСТВО

Проблемное поле творчества И. Бродского широко и разнообразно. Основное место в нем занимают такие категории культуры, как пространство и время, жизнь и смерть, личность, язык, а также такие всеобъемлющие духовные понятия, как Бог, свобода, добро, красота и др. Все они напрямую связаны с представлениями Бродского о субъекте культуры, чаще всего представленном в его поэзии в качестве «частного человека».

В своем творчестве поэт создает два противостоящих друг другу пространства – государственное, отождествленное с коллективным бытием, и пространство культуры, отождествленное с индивидуальным бытием. Пространство культуры



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ